аб'яднанням, стала для ыіх добрым прыкладам удалага выжывання ў неспрыяльных умовах.


**Літаратура**

1. *Myroslava M. Murdak.* Lost in the Widening Crack and Now Resurfased: Dissidence in Ukranianpaingting in Alla Rosenfeld and Norton T. Dodge (eds) From Gulag to Glasnost/ Nonkonformist Art from the SU. The State University of Jersey. 1995.
2. *Барабанаў К. У.* Выяўленчае мастацтва Беларусі. Жывапіс 60- пачатку 80-х гг. // Народная асвета. 1995. №8. С. 95.
3. *Денисюк О.Л.* Неформальные объединения, общественно-политические движения, партии в СССР: предпосылки, становление, развитие (1985 – 1991). Мн. 2003.
4. *Марачкін А.* «...І было такое адчуванне, што кожны ратуецца паасобку»//Народная газета. 1992. 17 лютага.
5. На Паддашку. Пра Міколу Ермаловіча, «Гутаркі» і 1970-я (Інтэрв'ю з Я. Кулікам) // Наша Ніва. 2001, №1, 3–9 с.


## АСНОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ТЭМЕ «РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНІЙ У ЧАС ВАЙНЫ 1812 Г.»


**А. Г. Старжынскі**


Крыніцы па разглядаемай тэме варта падзяліць на дакументальныя і апавядальныя. Больш значнае месца ў даследаванні гэтага пытання належыць першым. Іх неабходна класіфікаваць на 1) заканадаўчыя крыніцы і актавыя крыніцы; 2) матэрыялы справаводства. Дакументы заканадаўства і актавыя крыніцы прадстаўлены не вельмі шырока, аднак па пытаннях, якія яны закранаюць гэта адзіныя крыніцы. Сярод дакументаў гэтай падгрупы апублікаваны тры: «Постановленіе Коммиссіи Временнаго Правительства Великаго Княжества Литовскаго объ обложеніи духовенства благотворительнымъ сборомъ. 17 сентября 1812 г.» [1, с. 187]; «Правила касательно формирования литовской кавалерии. 1.08.1812 г.» [1, с. 216] і «Актъ присоединенія Временнаго Литовскаго Правительства и обывателей Великаго Княжества Литовскаго к Генеральной Конфедераціи Польскаго Королевства.» [1, с. 103] Першы дакумент непасрэдна датычыцца духавенства, а астатнія закранаюць яго ўскосна.

Да заканадаўчых крыніц па гэтай тэме адносяцца таксама неапублікаваныя нарматыўныя унутрыкасцёльныя дакументы. Іх два: 1) Прадпісанне «z Mińskej Tymczasowej Duchownej Kommissyi» – Ксяндзам Дэканам Мінскай дыяцэзіі ў якім даюцца рэкамендацыі да формы малітвы за Напалеона, аднавіцеля Польскай Айчыны з тэкстам малітвы [3, с. 114]. Датавана 19.07.1812 г. Падпісалі: к с. Ігнацы Кандратовіч, сакратар Віцэнты Стэфаноўскі, Францішак Будунковіч – pomocznik.; 2) Распараджэнне біскупа Мінскага Я. Дзядзеркі ад 22.10.1812 г. ў адпаведнасці з

распараджэннем Камісіі Часовага Ўрада ВКЛ: ствараць у кожным дэпартаменце адмысловыя шпітальныя камісіі, у склад якіх уваходзіў адзін ксёндз, які прызначаўся Дыяцэзіяльным біскупам [3, с. 115–116].

Нягледзячы на нешматлікасць гэтыя матэрыялы выключна важныя, бо дазваляюць ліквідаваць істотныя прабелы ў закранаемых імі аспектах дзейнасці Касцёла на часе вайны 1812 г. Напрыклад толькі апошні дакумент дае нам магчымасць меркаваць аб арганізаванай дабрачыннай дзейнасці Касцёла ў 1812 г.

Самай шматлікай групай дакументальных крыніц з'яўляюцца матэрыялы справаводства. У большасці сваёй гэта матэрыялы справаздачнага характару. Сярод іх значнае месца займаюць гістарычныя запіскі аб стане пэўнай губерніі на часе вайны. Захаваліся запіскі па Магілёўскай [2, с. 15–19], Мінскай [1, с. 461–468], Гродненскай [1, с. 433–451] і Віленскай [1, с. 391 губернiях. Яны складаліся грамадзянскімі губернатарамі (акрамя Магілёўскай, складзенай губернскім прадвадзіцелем дваранства) у 30-я гг. XIX ст. у чатырох асобніках: імператару, генерал-губернатару, міністру ўнутраных спраў, дзеля ўнутранага захавання. Іх асаблівасць у тым, што складаліся яны сучаснікамі апісваемых падзей, але праз 20–25 гадоў пасля іх, што не магло не паўплываць на дакладнасць утрымліваемых звестак. Аднак найбольш важная інфармацыя нярэдка знаходзіць пацьвярджэнне ў іншых крыніцах. Важна тое, што ў гэтых запісках утрымліваецца не толькі апісанне стану губерніі ў 1812 г., але і звесткі аб значных падзеях на тэрыторыі.

Да матэрыялаў справаводства адносяцца таксама неапублікаваныя унутрыкасцёльныя распараджэнні ненарматыўнага характару, значнасць якіх супастаўляльна са значнасцю вышэйузгаданых неапублікаваных дакументаў заканадаўства. Тут неабходна ўзгадаць распараджэнне Мінскай Духоўнай Камісіі ад 24 верасня 1812 г., якое загадвала адслужыць уваўсіх касцёлах хвалебныя набажэнствы падзякі за паспяховы пераход Напалеонам Нёмана, Дзвіны і Дняпра, за перамогі пад Магілёвам, Дрысай, Полацкам, Астроўнай і Смаленскам і нарэшце – пад Масквой [3, с. 115].

Што датычыць апавядальных крыніц то яны прадстаўлены матэрыяламі перыядычнага друку, да якіх належаць публікацыі з газет «Kurier Litewski» і «Tymczasowa Gazeta Mińska». Гэта былі афіцыйныя выданні мясцовых органаў улады. Зыходзячы з гэтага відавочна, што яны адлюстроўвалі афіцыйную ўладную пазіцыю. Матэрыялы гэтых газет з'яўляюцца незаменнымі дзеля раскрыцця такіх пытанняў, як святкаванні дня нараджэння і тэзаіменства Напалеона, дабрачынная дзейнасць Касцёла, святкаванне перамог французскіх войскаў.

Існуе таксама такая крыніцазнаўчая праблема як «Записка Виленскяго Прелата Цывинскаго о пребываніи Наполеона въ Вильне, в 1812 году»

[1, с. 414–415]. Важнасць гэтага дакументу палягае ў яго змястоўнасці і падрабязнасці: ён быў складзены відавочцам гэтых падзей праз не вельмі доўгі час пасля іх. Аднак адсутнасць адрасату не дазваляе аднесці яе да канкрэтнай групы крыніц.

Такім чынам па разглядаемай тэме маецца не вельмі шмат крыніц і вельмі часта неабходная інфармацыя ўтрымліваецца ў крыніцах па сумежных тэмах.

**Літаратура**


1. Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению великого князя Михаила Александровича / Под редакцией К. Военского. – Санкт-Петербург: типография А. Ф. Штольца, 1909. Т. 1. 582 с.; 1912. Т. 3. 498 с.
2. Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению великого князя Михаила Александровича / Под редакцией *К. Военского*. Санкт-Петербург: типография А. Ф. Штольца, 1912. Т. 3. 498 с.
3. Нацыянальны Гістарычны Архіў РБ, ф. 937 Мінская р.-к. кансісторыя, в. 2, а/з. 51, лл. 114–116


## А. КІРКОР ЯК РЭДАКТАР «ВИЛЕНСКОГО ВЕСТНИКА»


**Т. М. Шырокава**


Гісторыя рэдагавання А. Кіркорам «Виленского вестника» пачынаецца 22 снежня 1859 г., калі імператар падпісаў рэскрыпт на яго арэнду на імя А. Кіркора [3, с. 4]. У адпаведнасці з кантрактам газета павінна была складацца з некалькіх раздзелаў, у якіх прадугледжвалася на дзвюх мовах друкаваць урадавыя пастанаўленні і распараджэнні, палітычныя ведамасці, навуковыя і літаратурныя матэрыялы, крытычныя і бібліяграфічныя агляды, карэспандэнцыю [6, с. 36].

Час рэдагавання «Виленского вестника» А. Кіркорам падзяляецца на тры перыяды. Перыяд з 1860 па 1861 гг. характэрызуецца дынамічным развіццём газеты, значным ростам колькасці падпісчыкаў і супрацоўнікаў, перавагай польскага тэксту над рускім. Другі перыяд – 1862 г. – 19 сакавіка 1864 г. – быў перыядам паступовага ўпадку «Вестника», яго русіфікацыі і часам пераходу на пазіцыі ўрадавай газеты. Трэці – 21 сакавіка 1864 г. – канец 1865 г., – характэрызуецца пераўтварэннем газеты ў рускамоўнае выданне.

Першы перыяд кіркораўскага «Вестника» прадстаўляе найбольшую вартасць. Пад назвай «Краёвыя ведамасці» друкаваліся распараджэнні цэнтральных і мясцовых улад. Побач з тэкстамі ўрадавых устаў і аб’яў змешчаны і невялікія нататкі з жыцця краю. Гэта частка друкавалася на дзвюх мовах. Толькі на рускай мове друкаваліся артыкулы, якія ўвахо-